# ГРАМАДЗЯНЕ ЎПЭЎНЕНА ГЛЯДЗЯЦЬ

## Згодна з сацдаследаваннем, удзел у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

**Беларусы дэманструюць электаральную актыўнасць: апытанне Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта пацвярджае, што абсалютная большасць жыхароў нашай краіны збіраецца пайсці на выбары, падтрымлівае палітыку, якую праводзіць дзеючы кіраўнік дзяржавы, і з аптымізмам глядзіць у будучыню. Атрыманыя даныя сацыялагічнага даследавання, якое праводзілася ў снежні 2024 года, прадставіла кіраўнік Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ Ірына ЛАШУК.**

Калі б выбары прайшлі сёння,
**ЗА КАГО Б ВЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ?**




У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных. © Інфаграфіка БЕЛТА

## ВЫСОКАЯ ЭЛЕКТАРАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ

У прыватнасці, рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Калі б выбары прайшлі сёння, за каго б вы прагаласавалі?» «За дзеючага кіраўніка дзяржавы» — так адказалі 82,5 % апытаных, «за альтэрнатыўнага кандыдата» — 2,9 %, «супраць усіх» — 7,9 %, «не буду галасаваць» — 6,7 %.

— Красамоўны факт: дзеючага кіраўніка дзяржавы гатовы падтрымаць на найбліжэйшых выбарах 82,5 апытаных рэспандэнтаў. Адпаведна, беларускае грамадства ўпэўнена ў дзяржаўным курсе, які рэалізоўваецца, у выбудоўванні міжнародных адносін, што стварае спрыяльную аснову для развіцця стратэгічнага ўзаемадзеяння з іншымі краінамі. Знешнепалітычнай формулай беларусаў з'яўляецца значнасць культурнай агульнасці краіны-партнёра ў спалучэнні з высокім узроўнем эканомікі і развіцця гандлёвых адносін, — заявіла Ірына Лашук.

Таксама яна агучыла даныя, згодна з якімі ўдзел у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь плануюць прыняць 85,5 % беларусаў.

Так, рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Ці збіраецеся вы прыняць удзел у маючых адбыцца выбарах?». «Так» адказалі 85,5 % апытаных, «не» — 4,8 %. Яшчэ не вызначыліся — 9,7 %.

— Людзі збіраюцца ўдзельнічаць у выбарах, зрабіць свой усвядомлены палітычны, стратэгічны выбар. Даследаванне паказала ўстойлівасць грамадска-палітычнай абстаноўкі і з'яднанасць грамадства, — пракаменціравала Ірына Лашук.

Адным са складнікаў гэтага з'яўляецца эканамічны аптымізм, які пануе ў грамадстве. Кіраўнік Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ пацвярджае гэты факт данымі, згодна з якімі больш за 73 % беларусаў лічаць, што эканамічная сітуацыя ў краіне праз пяць гадоў застанецца такой жа або стане яшчэ лепшай.

Напрыклад, рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Як, на вашу думку, зменіцца эканамічная сітуацыя ў краіне праз пяць гадоў?». Застанецца такой жа або палепшыцца — так лічаць 73,1 % апытаных. Крыху пагоршыцца — 2,4 %, істотна пагоршыцца — 1,3 %.

Як, на вашу думку,
**ЗМЕНІЦЦА ЭКАНАМІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў КРАІНЕ ПРАЗ 5 ГАДОЎ?**




У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных. © Інфаграфіка БЕЛТА

— Гэта сведчыць аб тым, што эканоміку краіны беларусы ўспрымаюць даволі стабільна. Яны ўпэўнены ў развіцці эканомікі, — адзначыла Ірына Лашук. — Аб'ектыўныя паказчыкі развіцця эканомікі з'яўляюцца пераканаўчымі для фарміравання думкі грамадзян. Яны арыентуюцца на аб'ектыўныя эканамічныя паказчыкі і робяць уласныя высновы, якія сведчаць аб упэўненасці ў заўтрашнім дні.

Не змаглі адказаць 23,2 % апытаных.

— Гэта людзі, якія не вельмі валодаюць аб'ектыўнымі паказчыкамі, не вельмі імі цікавяцца. А наогул тое, што людзі не задумваюцца, як будзе развівацца эканоміка, — таксама станоўчы момант. Паколькі калі ўсё добра, то навошта пра гэта думаць? Гэта сведчыць аб адсутнасці крызісу, — дапоўніла эксперт.

Ад выбранага Прэзідэнта беларусы чакаюць стабільнага і бяспечнага жыцця, актыўнага развіцця эканомікі.

Ці збіраецеся вы прыняць удзел
**У МАЮЧЫХ АДБЫЦЦА ВЫБАРАХ?**




У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных. © Інфаграфіка БЕЛТА

Чаго вы чакаеце ад
**ВЫБРАНАГА ПРЭЗІДЭНТА?**




У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных. © Інфаграфіка БЕЛТА

Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Чаго вы чакаеце ад выбранага Прэзідэнта?». Стабільнага і бяспечнага жыцця — так адказалі 57,3 %, актыўнага развіцця эканомікі — 12,9 %, павышэння сацыяльных гарантый для грамадзян — 7,8 %, павышэння ролі і статусу Беларусі на міжнароднай арэне — 6,8 %, стварэння ўмоў для самарэалізацыі моладзі — 6,3 %, паляпшэння супрацоўніцтва з іншымі краінамі — 5,7 %, больш цесных адносін са славянскімі краінамі — 1,5 %, далейшага развіцця партый і грамадзянскай супольнасці — 0,7 %, іншага — 0,9 %.

— Першую пазіцыю займае стабільнае і бяспечнае жыццё. Гэта тое, чаго не хапае Еўропе. Беларусы разумеюць і ўсведамляюць каштоўнасць стабільнага і бяспечнага жыцця і чакаюць гэтага ў найбліжэйшыя пяць гадоў, — падкрэсліла эксперт.

## СЕРБЫ БАЧАЦЬ У БЕЛАРУСІ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРА

Трэба сказаць, што ў снежні 2024 года было праведзена сустрэчнае сацдаследаванне паміж Беларуссю і Сербіяй. У Сербіі даследаванне арганізавана Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі з прыцягненнем незалежнага даследчага цэнтра House of Win. У Рэспубліцы Беларусь апытанне правёў Цэнтр сацыяльна-гуманітарных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. У Беларусі апытанне праводзілася метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў). Асноўная мэта — выявіць асаблівасці ўзаемнага ўспрымання беларусаў і сербаў, вызначыць найбольш перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва і развіцця дружалюбных адносін паміж дзвюма краінамі. З улікам супадзення часу даследавання з выбарчай кампаніяй у Беларусі асобны блок пытанняў беларускай часткі даследавання датычыўся ацэнкі грамадзянамі сацыяльна-палітычнай абстаноўкі і прыярытэтных электаральных установак грамадзян.

## ШТО ПАКАЗАЎ АНАЛІЗ СЕРБСКАГА БЛОКА АПЫТАНЫХ?

Галоўны вынік — санкцыйны націск Захаду не ўплывае на ўспрыманне сербамі Беларусі як стратэгічна значнага партнёра.